ЗАЦВЯРДЖАЮ:
Начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гродзенскага аблвыканкама
_______________ А.Л.Вярсоцкі

# ІНСТРУКЦЫЯ
аб парадку арганізацыі і правядзенні
абласнога фестывалю рэгіянальнага фальклору
"ПАНЯМОННЯ ЖЫВАТВОРНЫЯ КРЫНІЦЫ"

**1.** Дадзеная Інструкцыя вызначае парадак арганізацыі і правядзення абласнога фестывалю рэгіянальнага фальклору "Панямонне жыватворныя крыніцы" (далей - Фестываль).

**2.** Мэтамі і задачамі Фестывалю з'яўляюцца: захаванне, падтрымка і актуалізацыя рэгіянальнай і лакальнай традыцыйнай нематэрыяльнай і матэрыяльнай культурнай спадчыны Гродзеншчыны; адраджэнне, развіццё, папулярызацыя лепшых традыцый і дасягненняў нацыянальнай культуры і мастацтва, далучэнне да іх шырокіх слаёў грамадства; выяўленне самабытных носьбітаў беларускага фальклору, захаванне іх творчасці, пашырэнне межаў іх дзейнасці; далучэнне дзяцей, падлеткаў, моладзі да гісторыка-культурнай спадчыны сваёй краіны і прапаганда традыцыйнай народнай творчасці Панямоння, павышэнне ўвагі да вывучэння мясцовых нацыянальных традыцый песенна-танцавальнага жанру, гульнёва-абрадавай спадчыны Гродзеншчыны.

**3.** Арганізатарамі Фестывалю з'яўляюцца: галоўнае ўпраўленне ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гродзенскага аблвыканкама, ДУК "Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці".

**4.** Фестываль адбываецца 1 раз у 2 гады.

**5.** Фестываль праводзіцца ў тры туры: 1 тур – раённыя адборачныя агляды; 2 тур – занальныя агляды па выніках 1 тура; 3 тур – заключны канцэрт лепшых калектываў і выканаўцаў (па выніках 2 тура) і вызначэнне пераможцаў фестывалю.

**6.** У рамках 1 тура кожны раён павінен правесці выстаўкі традыцыйных рамёстваў, адборачныя агляды фальклорных праграм і нумароў калектываў, індывідуальных выканаўцаў раёна з мэтай вылучэння лепшых для ўдзелу ў 2 туры.

**7.** У рамках 2 і 3 тураў праводзіцца конкурс на лепшае выкананне фальклорных твораў і лепшае адлюстраванне рэгіянальных традыцый у выстаўцы традыцыйных рамёстваў.

**8.** У 2 туры Фестывалю прымаюць удзел лепшыя фальклорныя калектывы і індывідуальныя выканаўцы, майстры народнай творчасці, якія прайшлі адборачныя туры ў раёнах.

**9.** Для ўдзелу ў 2 туры кожны раён прадстаўляе:

- канкурсную праграму працягласцю ад 20 да 50 хвілін *(удзельнікі Фестывалю прадстаўляюць фальклорныя праграмы, якія скіраваны на змястоўнае раскрыццё мастацкіх традыцый сваёй мясцовасці: адноўленыя і бытуючыя аўтэнтычныя песні каляндарнага і сямейна-родавага цыклаў, пазаабрадавыя песні, карагоды, танцы (сольныя, парныя, гуртавыя), гульні, інструментальную музыку, творы празаічных жанраў)*
- фатаграфіі ўсіх індывідуальных выканаўцаў і калектываў-удзельнікаў Фестывалю на электронных носьбітах.
- заяўку, творчыя характарыстыкі, праграмы выступленняў на электронных носьбітах.
- экспанаты для выстаўкі традыцыйных рамёстваў.

**Выкананне аўтарскіх, апрацаваных альбо стылізаваных твораў не дазваляецца.**

**10.** Вылучэнне лепшых выканаўцаў, калектываў, майстроў народнай творчасці па выніках 2 і 3 тураў ажыццяўляе журы, у склад якога ўключаны прадстаўнікі галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гродзенскага аблвыканкама і спецыялісты ДУК "Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці", навукоўцы, кампітэнтныя асобы данным накірунку мастацтва.

**11.** Па выніках конкурса журы вызначае лаўрэатаў (І, ІІ, ІІІ ступені) ў асноўных **намінацыях**:

- аўтэнтычны фальклорны гурт;
- дарослы фальклорны ансамбль;
- дзіцячы фальклорны ансамбль;
- індывідуальны выканаўца (народная проза);
- індывідуальны выканаўца (сольныя спевы, дуэты);
- індывідуальны выканаўца (інструментальная творчасць);
- фальклорны інструментальны ансамбль;
- фальклорны танцавальны калектыў (побытавыя танцы);

а таксама вылучае лепшых у спецыяльных намінацыях:

- лепшы дэбют;
- пераемнасць традыцый;
- самабытнасць і адметнасць выканальніцкага стылю;
- арыгінальнае адлюстраванне танцавальнай спадчыны свайго краю;
- дзейсная папулярызацыя абрадавых і святочных традыцый Гродзенскага Панямоння;
- лепшая рэжысура раённай праграмы ў 2 туры;

- лепшае адлюстраванне рэгіянальных традыцый у выстаўцы традыцыйных рамёстваў.

**12.** Журы мае права не прысвойваць месцы, падзяляць II, III месцы, уводзіць новыя ці аб'ядноўваць намінацыі ў рамках выдзеленага прызавога фонду.

**13.** Пры падвядзенні вынікаў журы карыстаецца наступнымі крытэрыямі:

- валоданне рэгіянальнай манерай выканання;
- захаванне мясцовага рэпертуару і мастацкага стылю;
- узровень выканальніцкага майстэрства (чысціня строя, манера гукавымаўлення, тэхніка ігры на музычных інструментах);
- эмацыянальнасць і непасрэднасць выканання;
- дакладнае веданне кампазіцыі танца, народнага танцавальнага этыкету;
- культура нашэння касцюма;
- адпаведнасць фальклорнага рэпертуару ўзросту выканаўцаў;
- жанравая разнастайнасць;
- наяўнасць этнічных строяў.

**14.** Па выніках конкурса ў 3 туры Фестывалю лепшым калектывам прысвойваюцца званні "лаўрэатаў (I, II, III ступені) абласнога фестывалю рэгіянальнага фальклору "Панямоння жыватворныя крыніцы" і ўручаюцца дыпломы ў рамках і прызы за перамогу ў асноўных намінацыях; уручаюцца дыпломы ў рамках і спецыяльныя прызы за перамогу ў спецыяльных намінацыях, выносяцца прапановы на ўдзел у рэспубліканскіх і міжнародных фестывалях, конкурсах, здымках на тэлебачанні, выступленнях на радыё.

Усе астатнія удзельнікі заключных мерапрыемстваў ўзнагароджваюцца дыпломамі за ўдзел у Фестывалі.

Па выніках галасавааня гледачоў уручаецца прыз глядацкіх сімпатый.

**15.** Усе выступленні 2 і 3 тураў фіксуюцца на відэа. Арганізатары Фестывалю захоўваюць неабмежаваныя правы на запіс і распаўсюджванне выступленняў калектываў рознымі тэхнічнымі сродкамі і спосабамі. За дадзеныя запісы ганарары выканаўцам не выплачваюцца.

**16.** Фінансаванне Фестывалю ажыццяўляецца за кошт сродкаў абласнога бюджэту, прадугледжаных у каштарысе ДУК "Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці". За кошт бюджэтных сродкаў фінансуюцца: заработная плата з налічэннямі запрошаным членам журы, вядучым (2), відэааператару; праезд іншагародніх членаў журы; прызы; спецыяльныя прызы; дыпломы; рамкі для дыпломаў; афішы.

Для фінансавання Фестывалю на ўсіх этапах могуць быць выкарыстаны іншыя крыніцы, не забароненыя заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

Дадатак № 1
да інструкцыі аб правядзенні
абласнога фестывалю
рэгіянальнага фальклору
“Панямоння жыватворныя
крыніцы”

# ГРАФІК

*правядзення II тура (занальныя агляды)*
*абласнога фестывалю рэгіянальнага фальклору*
*“Панямоння жыватворныя крыніцы”*

**- 27 мая 2017г. ДУК “Смаргонскі раённы цэнтр культуры”. Пачатак 12.00. Прыбыццё да 11.00.**

Прымаюць удзел:

- Астравецкі раён,
- Ашмянскі раён,
- Смаргонскі раён.

**- 28 мая 2017г. філіял “Тарноўскі Дом культуры” ДУ “Лідскі раённы цэнтр культуры і народнай творчасці”.**

Прымаюць удзел:

- Воранаўскі раён,
- Лідскі раён,
- Іўеўскі раён.

**- 03 чэрвеня 2017г., ДУК “Навагрудскі раённы цэнтр культуры і народнай творчасці”**

Прымаюць удзел:

- Карэліцкі раён,
- Дзятлаўскі раён,
- Навагрудскі раён.

**- 04 чэрвеня 2017г., сельскі клуб “Азеркі” ДУ “Мастоўскі раённы цэнтр культуры”. Пачатак у 12.00. Прыбыццё да 11.00**

Прымаюць удзел:

- Слонімскі раён,
- Мастоўскі раён,
- Шчучынскі раён,
- Зэльвенскі раён.

**11 чэрвеня 2017г. аддзел культуры і дасуга “Вярэйкаўскі Дом культуры” ДУК “Ваўкавыскі раённы цэнтр культуры і народнай творчасці”**

Прымаюць удзел:

- Ваўкавыскі раён,
- Бераставіцкі раён,
- Свіслацкі раён.
- Гродзенскі раён.

Дадатак № 2
да інструкцыі аб правядзенні абласнога фестывалю рэгіянальнага фальклору "Панямоння жыватворныя крыніцы"

## СКЛАД АРГКАМІТЭТА

| | |
|---|---|
| **Вярсоцкі А.Л.** | начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гродзенскага аблвыканкама, старшыня аргкамітэта. |
| **Клімовіч А.В.** | першы намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гродзенскага аблвыканкама, сустаршыня аргкамітэта. |
| **Дземянчук І.Д.** | дырэктар ДУК "Гродзенскі АМЦНТ", намеснік старшыні аргкамітэта. |
| **Аўчыннікаў А.Ф.** | вядучы метадыст ДУК "Гродзенскі АМЦНТ". |
| **Галалобава Л.В.** | вядучы метадыст ДУК "Гродзенскі АМЦНТ". |
| **Грыгаран Т.У.** | намеснік дырэктара ДУК "Гродзенскі АМЦНТ". |
| **Дзейкала С.С.** | начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Мастоўскага райвыканкама. |
| **Жук-Куніцкая І.Ю.** | галоўны спецыяліст галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гродзенскага аблвыканкама. |
| **Рабец І.Г.** | начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Лідскага райвыканкама. |
| **Рамановіч Н.І.** | начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гродзенскага райвыканкама. |
| **Ражэва Т.М.** | начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Смаргонскага райвыканкама. |
| **Салавей І.А.** | намеснік начальніка аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі |

| | |
|---|---|
| | Ваўкавыскага райвыканкама, сустаршыня аргкамітэта. |
| **Шабановіч М.К.** | начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Навагрудскага райвыканкама. |
| **Шлавянец В.Ф.** | вядучы метадыст ДУК “Гродзенскі АМЦНТ”. |

Дадатак № 3
да інструкцыі аб правядзенні абласнога фестывалю рэгіянальнага фальклору "Панямоння жыватворныя крыніцы"

## СКЛАД ЖУРЫ

| | |
|---|---|
| **Варфаламеева Т.Б.** | старшы навуковы супрацоўнік Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К.Крапівы Нацыянальнай Акадэміі навук Беларусі, кандыдат мастацтвазнаўства, старшыня журы (са згоды). |
| **Клімовіч А.В.** | першы намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гродзенскага аблвыканкама, сустаршыня журы. |
| **Боганева А.М.** | навуковы супрацоўнік сектара этналінгвістыкі і фальклора Інстытута мовы і літаратуры імя Я.Купалы і Я.Коласа Нацыянальнай Акадэміі навук Беларусі, намеснік старшыні журы (са згоды). |
| **Аўчыннікаў А.Ф.** | вядучы метадыст ДУК "Гродзенскі АМЦНТ". |
| **Галалобава Л.В.** | вядучы метадыст ДУК "Гродзенскі АМЦНТ". |
| **Грыгаран Т.У.** | намеснік дырэктара ДУК "Гродзенскі АМЦНТ". |
| **Дземянчук І.Д.** | дырэктар ДУК "Гродзенскі АМЦНТ". |
| **Жук-Куніцкая І.Ю.** | галоўны спецыяліст галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гродзенскага аблвыканкама. |
| **Пятрук А.П.** | вядучы метадыст ДУК "Гродзенскі АМЦНТ". |
| **Шлавянец В.Ф.** | вядучы метадыст ДУК "Гродзенскі АМЦНТ". |

Дадатак № 4
да інструкцыі аб правядзенні абласнога фестывалю рэгіянальнага фальклору "Панямоння жыватворныя крыніцы"

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі райвыканкама
. 2017 г.

# ЗАЯЎКА
на ўдзел у абласным фестывалі рэгіянальнага фальклору "Панямоння жыватворныя крыніцы"

1. Назва конкурснай праграмы:

________________________________________

________________________________________

________________________________________

________________________________________

2. Спіс калектываў-удзельнікаў і індывідуальных выканаўцаў, удзельнікаў фестывалю:

________________________________________

________________________________________

________________________________________

________________________________________

________________________________________

3. Прозвішча, імя , імя па бацьку і кантактны тэлефон рэжысёра-пастаноўшчыка (кіраўніка) конкурснай праграмы

________________________________________

________________________________________

Подпіс кіраўніка
РЦКНТ (РМЦНТ)

Заяўкі на ўдзел у фестывалі дасылаць **да 20 мая** на адрас:
230025, г.Гродна, ДУК "Гродзенскі АМЦНТ", вул. Савецкая, 8.
Кантактныя тэлефоны ў Гродна: 8 (0152) 72 04 16, тэл/ф 72 27 04